Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

5 мая 2016 года, № 7 (2154)

# Ганаровая вахта памяці да свята Вялікай Перамогі



**24 красавіка БДУ ўпершыню прыняў удзел у міжнароднай добраахвотніцкай грамадзянска-патрыятычнай акцыі «15 дзён да Вялікай Перамогі».**

Праект мае высакародныя мэты: маральнае выхаванне моладзі, умацаванне патрыятычнага духу і згуртаванасці ў студэнцкім асяроддзі.

У гэты дзень адначасова з 14.00 да 16.00 студэнты ўніверсітэтаў Беларусі, Расіі, Малдовы, Азербайджана і Кыргызстана неслі ганаровую варту ля помнікаў і мемарыяльных аб'ектаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – першая беларуская ВНУ, якая далучылася сёлета да міжнароднай вахты памяці. Актывісты БРСМ вядучай ВНУ годна неслі варту ля помніка студэнтам, выкладчыкам і супрацоўнікам БДУ, загінулым падчас Вялікай Айчыннай вайны (унутраны дворык БДУ, пр. Незалежнасці, 4), і ля помніка экіпажу Гастэла (г. п. Радашковічы Мінскага раёна).

Рэалізацыя праекта прадугледжвала і правядзенне маніторынгу стану мемарыяльных комплексаў з далейшым іх аднаўленнем. З лютага сёлетняга года студэнты БДУ зладзілі суботнікі па акультурванні пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны і фасадаў дамоў з памятнымі таблічкамі. Акрамя таго, студэнты актыўна займаюцца навуковымі даследаваннямі па вывучэнні подзвігаў землякоў – Герояў Савецкага Саюза.

Дадзеная акцыя – гэта ініцыятыва Студэнцкай асамблеі пры падтрымцы ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю і БРСМ БДУ.

Дарэчы, міжнародная добраахвотніцкая грамадзянска-патрыятычная акцыя «15 дзён да Вялікай Перамогі» ўпершыню прайшла ў 2010 годзе ў Самары па ініцыятыве рэгіянальнай моладзевай грамадскай арганізацыі «Студэнцкі савет Самарскай вобласці».

У 2014 годзе акцыя выйшла на міжнародны ўзровень. Пасты памяці былі выстаўлены ў чатырох краінах: Малдова, Азербайджан, Кыргызстан, Расія. Тады вахту неслі 268 пастоў з удзелам больш як 2000 чалавек.

**Максім ВЕЧАР**

ДАСЯГНЕННІ

# БДУ ізноў атрымаў галоўны прыз TIBO

Інтэрнэт-партал Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта заняў першае месца ў намінацыі «Адукацыя і навука» інтэрнэт-прэміі TIBO–2016.

Другое месца ў гэтай катэгорыі ў афіцыйнага рэсурсу Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта, трэцяе вырашана не прысуджаць. Адмысловыя дыпломы ўручаны Лідскім спецыяльным яслям-саду № 16 для дзяцей з парушэннямі зроку і яслям-саду № 3 Рэчыцы.

У гэтай намінацыі змагаліся 47 праектаў.

Распрацоўшчыкам сайта БДУ выступіў Цэнтр інфармацыйных тэхналогій (ЦІТ). *Начальнік медыяцэнтра БДУ, галоўны рэдактар сайта ўніверсітэта* ***Павел Салаўёў*** адзначае: «Узнагарода TIBO з'яўляецца заслугай шматлікіх структурных падраздзяленняў, што зрабілі

ўнёсак у стварэнне магутнага шматпрофільнага інфармацыйнага і адукацыйнага рэсурсу, якім стаў за апошнія гады сайт БДУ, напаўняючы яго актуальным кантэнтам, падаючы інфармацыю і спрыяючы максімальна поўнай прадстаўленасці БДУ ў інтэрнэт-прасторы».

Цырымонія ўручэння прэмій адбылася 21 красавіка ў бізнес-цэнтры гасцініцы «Вікторыя». Узнагароду інтэрнэт-прэміі TIBO-2016 уручыў *начальніку ЦІТ* ***Юрыю Варатніцкаму*** першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Вадзім Богуш (на фота).

Адзначым таксама, ЦІТ з'яўляецца распрацоўшчыкам праграмнага забеспячэння партала *pravo.by*, які стаў пераможцам у намінацыі «Органы дзяржаўнага ўпраўлення».

**Даведка**

Інтэрнэт-прэмія TIBO XXIII Міжнароднага спецыялізаванага форуму па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях штогод прысуджаецца сеткавым працам, створаным у беларускім сектары Інтэрнэт за важкія мастацкія, тэхналагічныя і сацыякультурныя дасягненні ў галіне інфармацыі, культуры, мастацтва і адукацыі.

З 2003 года ў конкурсе прынялі ўдзел больш за 7000 беларускіх інтэрнэт-рэсурсаў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## У нумары:

НАВЕЧНА Ў ПАМЯЦІ

71-ю гадавіну Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг. разам з універсітэцкай супольнасцю адзначаюць 26 ветэранаў БДУ

*Стар. 2*

ПРА ЗМЕНЫ Ў КОДЭКСЕ АБ АДУКАЦЫІ

26 красавіка студэнцкі савет па якасці адукацыі зладзіў круглы стол «Рэйтынгавая сістэма ацэньвання ў БДУ»

*Стар. 3*

РЫЦАРСКІЯ БАІ І СЯРЭДНЯВЕЧНЫЯ ТАНЦЫ

Дні беларускай гісторыі ўпершыню прайшлі 27-28 красавіка ў ДІКСТ

*Стар. 4*

## Весткі з рэктарата

**Святкаванне 71-й гадавіны Вялікай Перамогі** адбудзецца 6 мая ва ўнутраным дворыку БДУ. Пачатак у 10.00.

Мітынг-рэквіем адкрые рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка і старшыня савета ветэранаў Мікалай Юрчук. Па традыцыі, усе ўдзельнікі ўрачыстай акцыі – ветэраны, кіраўніцтва ВНУ, студэнты і выкладчыкі – ускладуць кветкі да помніка студэнтам і выкладчыкам БДУ, загінулым на франтах у барацьбе з фашысцкімі акупантамі.

У вядучай ВНУ краіны Дзень Перамогі асабліва шанаваны і памятны. Нагадаем, 23 чэрвеня 1941 года са студэнцкіх аўдыторый і інтэрнатаў БДУ на фронт сышлі добраахвотнікамі адразу больш за 500 чалавек.

Штогод ветэраны Вялікай Айчыннай вайны атрымліваюць падарункі ад кіраўніцтва ўніверсітэта. У гэты дзень у БДУ павіншуюць 26 салдат Перамогі, якія засталіся. Для іх будзе арганізаваны музычны канцэрт «Перамога ў сэрца кожнага» харавых калектываў – удзельнікаў міжнароднага форуму «Папараць-кветка БДУ». Тут прагучаць папулярныя і любімыя песні ваенных гадоў вядомых кампазітараў Барыса Макравусава, Іосіфа Дунаеўскага, Давіда Тухманава і інш. Акрамя таго, для ветэранаў будзе арганізаваны ўрачысты прыём.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення па справах культуры БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Навечна ў памяці

**Набліжаецца знамянальная дата ў гісторыі нашай краіны – 71-я гадавіна Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.**

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА і Аляксандра СНАПКА

*Ветэраны БДУ на святочным мерапрыемстве да Дня Перамогі 7 мая 2015г.*

Для нашага народа памяць пра вогненныя ваенныя гады – незабыўнае свята, якое захоўваецца для новых пакаленняў, што толькі распачынаюць жыццё. Вайна прынесла на нашу зямлю нечуваныя разбурэнні, гэта каласальная трагедыя для людзей, незагойны боль стратаў амаль у кожнай сям'і. Але для нас падзеі той вайны маюць як трагічнае, так і гераічнае значэнне. Таму памяць пра іх напоўнена смуткам па незваротных людскіх стратах і пачуццём гонару за вялікія подзвігі. Подзвіг беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне назаўсёды застанецца ў памяці ўсяго чалавецтва, таму што гэта была перамога дабра над злом, чалавечай годнасці над зняволеннем, розуму над цемрашальствам.

Адзначаючы сусветна гістарычнае значэнне Вялікай Перамогі, мы падкрэсліваем важнасць прапаганды славутых баявых і працоўных традыцый народа, ваенна-патрыятычнай і абаронча-масавай работы. Нашы людзі, і перш за ўсё моладзь, павінны быць гатовымі да абароны сваёй айчыны. У рэалізацыі гэтай высакароднай задачы значны ўнёсак робяць ветэраны – жывыя сведкі і ўдзельнікі баявых дзеянняў мінулай вайны, непасрэдныя творцы Вялікай Перамогі.

Зараз у БДУ засталося толькі 26 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Яны аб'яднаны ў адпаведных секцыях, створаных на факультэтах, упраўленнях і аддзелах універсітэта. Назавём іх пайменна:

**Біяфак**

1. Гаравец Валянціна Канстанцінаўна (17.09.1922)

**Геафак**

2. Фешчанка Фёдар Сяргеевіч (25.09.1925)

**Гістфак**

3. Дударава Таццяна Яфімаўна (15.05.1922)
4. Котаў Альберт Іосіфавіч (28.10.1937)

**Інстытут журналістыкі**

5. Дубовік Вадзім Іванавіч (28.12.1923)
6. Львова Надзея Барысаўна (19.07.1924)
7. Сачанка Іван Іванавіч (08.11.1938)

**ММФ**

8. Каванава Таццяна Фёдараўна (08.01.1921)

**ФФСН**

9. Давідзюк Георгій Пятровіч (05.07.1923)

**Фізфак**

10. Дабрэга Віктар Пятровіч (09.12.1926)
11. Цегін Леанід Рыгоравіч (11.06.1927)

**Хімфак**

12. Кніга Маргарыта Вітальеўна (18.09.1920)

**Эканамічны факультэт**

13. Аляксееў Васіль Герасімавіч (07.06.1927)

**Юрфак**

14. Драбязка Сцяпан Рыгоравіч (07.08.1922)
15. Дулаў Андрэй Васільевіч (21.10.1924)
16. Прудніченка Вольга Львоўна (20.11.1923)
17. Чыгір Васіль Фёдаравіч (08.09.1924)
18. Юркевіч Мікалай Рыгоравіч (18.01.1928)

**Кафедра замежных моў**

19. Янушкевіч Ганна Вікенцьеўна (11.06.1923)

**Упраўленні, службы і студгарадок**

20. Гурын Яўген Аляксандравіч (10.02.1935)
21. Іўлеў Яфім Іпалітавіч (23.03.1915)
22. Пермякоў Пётр Іванавіч (12.07.1927)
23. Савейка Зоя Іванаўна (17.01.1938)
24. Трубач Васіль Іосіфавіч (31.07.1927)
25. Шымко Ларыса Аляксандраўна (13.11.1935)
26. Яцкевіч Кацярына Міхайлаўна (20.01.1930)

Як бачыце, у шматтысячным універсітэцкім калектыве ветэраны вайны складаюць менш за долю працэнта ад агульнай колькасці студэнтаў і выкладчыкаў, але па сутнасці яны па-ранейшаму застаюцца важнай і ўплывовай сілай нашай alma mater. Заслужаным аўтарытэтам у рэктарате і студэнцкіх грамадскіх арганізацыях карыстаюцца: ганаровы старшыня савета ветэранаў Таццяна Яфімаўна Дударава (у час вайны медсястра эвакашпіталя і камсамольскі работнік, пасля вайны дацэнт гістарычнага факультэта) і дзейны старшыня савета ветэранаў БДУ Мікалай Іосіфавіч Юрчук (лаўрэат дзяржаўнай прэміі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі).

Актыўны ўдзел у жыцці сваіх факультэтаў, у дапамозе дэканатам, прафкамам і камітэтам БРСМ у падрыхтоўцы і правядзенні ўрачыстых мерапрыемстваў, прысвечаных дзяржаўным святам, дням факультэтаў, у тэматычных вечарах і ўроках мужнасці прымаюць ветэраны вайны Г. П. Давідзюк, С. Р. Драбязка, В. Ф. Чыгір, М. Р. Юркевіч, І. І. Сачанка і іншыя.

Адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці ветэранаў з'яўляецца іх удзел у грамадзянска-патрыятычным выхаванні студэнцкай моладзі і перадачы ёй баявых і працоўных традыцый беларускага народа і яго Узброеных Сіл. Ва ўмовах абвастрэння інфармацыйнай і ідэалагічнай барацьбы ветэраны дапамагаюць юнакам і дзяўчатам аб'ектыўна асэнсаваць вопыт старэйшых пакаленняў, і галоўнае – глыбей зразумець асабістую адказнасць кожнага за лёс сваёй Айчыны.

Гэтым самым нашы славутыя ветэраны выконваюць надзвычай адказную місію – спрыяюць фарміраванню пакалення сацыяльна актыўных людзей, якія ўмеюць эфектыўна працаваць і быць заўсёды гатовымі да абароны сваёй радзімы. Дадзеная місія не страчвае, а набывае яшчэ большую актуальнасць, калі праблемы гісторыі вайны, яе вынікаў і ўрокаў, вырашальнай ролі савецкага народа і савецкай арміі ў разгроме фашызму паступова нівеліруюцца, набываюць усё больш фармальнае, энцыклапедычнае аблічча, становяцца здабыткам толькі вузкіх спецыялістаў: гісторыкаў, палітолагаў, журналістаў.

Не заціхаюць, а нават усё больш мацней разгараюцца спрэчкі пра тыя альбо іншыя падзеі вайны. У некаторых краінах Заходняй Еўропы, Злучаных Штатах Амерыкі насельніцтва чамусьці верыць, што менавіта іх дзяржавы перамаглі фашызм. У іншых краінах, у тым ліку вызваленых савецкімі войскамі ад «карычневай чумы», камунізм прыраўноўваецца да фашызму. Пры такім веданні гісторыі не выклікаюць здзіўлення факты знішчэння помнікаў савецкаму салдату-пераможцу. Прыклады можна прыводзіць бясконца, у тым ліку па Польшчы, Эстоніі, Латвіі, Літве і нават Украіне. І яшчэ больш жахліва, што нават на нашай беларускай зямлі, якая перанесла столькі бядоты і пакутаў за гады ваеннага ліхалецця, сустракаюцца факты «жарцікаў» асобных прадстаўнікоў моладзі з фашызмам, безразборлівага захаплення нацыяналістычнымі і нацысцкімі ідэямі, нездаровая цікавасць да фашысцкай сімволікі, рамантызацыя вобразаў гітлераўскіх паплечнікаў, у прыватнасці гаўляйтара Вільгельма Кубэ, які выстаўляецца ў якасці рупліўца беларускай культуры, адукацыі і мовы. Адсюль сустракаюцца навуковападобныя развагі тыпу: а навошта ўвогуле было перамагаць Германію, а можа, лепш каб Германія нас заваявала. Пры гэтым прыводзяцца дагматычна выхапленыя з агульнага кантэнту ходу, вынікаў і ўрокаў вайны аргументы: хто больш страціў людзей у той вайне – мы альбо немцы? Канечне, мы. А хто цяпер жыве лепей? Яны.

На жаль, ва ўмовах глабальнага супрацьстаяння ў свеце, з'яўлення новых відаў войнаў, такіх як інфармацыйныя, псіхалагічныя, гібрыдныя, знаходзіцца нямала маладых людзей, недасведчаных, не абцяжараных навуковымі, і ў прыватнасці, гуманітарнымі ведамі, якім падаецца, што ў выпадку перамогі немцаў у той вайне мы б мелі сытае і заможнае жыццё, як сёння ў Германіі. Такія «разумнікі», якія здабываюць веды не з аб'ектыўных крыніц, а галоўным чынам з розных, у тым ліку сумнеўных матэрыялаў з «сусветнага павуцiння», спрабуюць са сваёй разумовай «вышыні» паказваць ветэранаў вайны падманутым, страчаным пакаленнем, іранізуюць з самой перамогі: якая ж гэта перамога, калі за дасягненне яе пакладзена столькі мільёнаў чалавечых жыццяў. Таму сёння, на мой погляд, надзвычай важным з'яўляецца далучэнне да праблем ваеннай гісторыі нашай моладзі, падлеткаў, дзяцей на аснове аб'ектыўных навуковых крыніц і дакументаў, сведчанняў саміх удзельнікаў той драматычнай і гераічнай вайны.

Хочацца засяродзіць увагу на напісанні супрацоўнікамі ўніверсітэта адмысловых прац па Вялікай Айчыннай вайне, што можна разглядаць як спецыфічную дзейнасць для БДУ, які з'яўляецца першым і вядучым універсітэтам у краіне, прызнаным цэнтрам вучэбна-навуковай і навукова-даследчай работы. Як чалавек, лёс якога звязаны з універсітэтам ужо больш за паўвека, магу засведчыць: выкладчыкі-ветэраны дасканала валодалі і валодаюць найноўшымі тэарэтыка-метадалагічнымі метадамі даследавання не толькі пры распрацоўцы базавых курсаў па матэматыцы, фізіцы, біялогіі і г. д. Тут варта нагадаць імёны такіх супрацоўнікаў універсітэта-ўдзельнікаў вайны, як: акадэмік І. М. Ігнаценка, прафесар А. Ц. Караткевіч, прафесар і рэктар БДУ ў 1972-1978 гг. У. М. Сікорскі, прафесар і Герой Савецкага Саюза А. А. Філімонаў, пад рэдакцыяй якіх апублікавана такая фундаментальная праца, як «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков» (Т.1-3, Мн., 1983).

Ветэранамі ўніверсітэта апублікаваны таксама мемуарныя творы пра свой удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Сярод іх кніга абаронцы Ленінграда, у 1950–1970-х гг. загадчыка кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў, Героя Сацыялістычнай Працы Мікалая Паўлавіча Яругіна «О тех, кто выстоял: записки фронтовика» (Мн., 1989), а таксама кніга выпускніка фізіка-матэматычнага факультэта 1941 г., а ў гады вайны – камандзіра групы падрыўнікоў партызанскай брыгады імя С. М. Кірава, Героя Савецкага Саюза – Уладзіміра Аляксеевіча Парахневіча «Огненные вихри: записки партизана» (Мн., 1969). Мемуары меншага фармату нашых выкладчыкаў – былых франтавікоў, партызанаў і працаўнікоў тылу – былі сабраны і апублікаваны мною ў кнізе памяці ўніверсітэта (падрабязней гл.: А. И. Котов «Белгосуниверситет в годы Великой Отечественной войны (1941-1945 гг.): Книга Памяти». - Мн., 2005, с.120-181).

Яшчэ большы масіў твораў пра трагедыю і гераізм народа ў гады вайны апублікавалі нашы ветэраны-літаратуразнаўцы: паэты Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Якуб Колас; пісьменнікі Алесь Адамовіч, Іван Навуменка, Алесь Якімовіч; журналісты Рыгор Булацкі, Іван Сачанка; этнографы і фальклярысты Васіль Бандарчык, Анатоль Фядосік.

Асабліва трэба сказаць пра творчасць Івана Мележа. У гады вайны ён самаахвярна змагаўся на фронце, а пасля чарговага цяжкага ранення самааддана працаваў выкладчыкам ваеннай падрыхтоўкі на ўсіх факультэтах універсітэта, што функцыянаваў на станцыі Сходня ў Падмаскоўі. Пасля вайны закончыў універсітэт (1945 г.), аспірантуру (1948 г.). Затым працаваў старшым выкладчыкам БДУ і адначасова ў часопісе «Полымя». З яго вялікай літаратурнай спадчыны дастаткова назваць знакамітую трылогію «Палескія хронікі» і раман «Мінскі напрамак», у якім адлюстраваны мужнасць і гераізм пры вызваленні Беларусі воінаў 3-га Беларускага фронту на чале з легендарным камандуючым І. Д. Чарняхоўскім.

Працы нашых ветэранаў і сёння перавыдаюцца масавымі тыражамі і карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў самых розных прафесійных і ўзроставых катэгорый насельніцтва і тым самым служаць справе грамадска-патрыятычнага выхавання моладзі.

Напрыканцы скажу, што свой унёсак у працяг славутых традыцый універсітэта ваенных і пасляваенных гадоў робяць сёння воіны-інтэрнацыяналісты, сярод якіх такія актыўныя выхавальнікі моладзі, як Мікалай Мікалаевіч Сурмач, Віктар Іванавіч Варабей, Уладзімір Іванавіч Панфілаў. А самымі надзейнымі і клапатлівымі памочнікамі ветэранаў вайны з'яўляюцца актывісты ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю (начальнік Аляксей Багамазаў) і камітэта БРСМ БДУ (сакратар Канстанцін Андрусевіч). У нас усіх агульная задача – фарміраванне цэласнай асобы студэнта, які валодае высокімі прафесійнымі ведамі, ідэйнай перакананасцю і жыве не толькі сучасным днём, а дбае пра годную будучыню сваёй сям'і, універсітэта і Беларусі.

**дацэнт Альберт КОТАЎ,**
**старшыня савета ветэранаў гістфака,**
**кіраўнік інфармацыйна-моладзевай**
**групы камітэта БРСМ БДУ**

ДЫСКУСІЯ

# Пра змены ў Кодэксе аб адукацыі

26 красавіка студэнцкі савет па якасці адукацыі зладзіў круглы стол «Рэйтынгавая сістэма ацэньвання ў БДУ». Асноўным спікерам была начальнік Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы Людміла ХУХЛЫНДЗІНА, апаніраваў ёй кіраўнік ССЯА Ігар ДУБАНОС. Акцэнт сустрэчы быў звернуты ў бок новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, які зараз узгадняецца ва ўрадзе.

## Неаднолькавыя каэфіцыенты на факультэтах

Рэйтынгавая сістэма працуе ў БДУ досыць даўно. Сутнасць яе ў тым, што фінальная адзнака, якую атрымлівае студэнт у залікоўку, складаецца з адзнакі за семінарскія, лабараторныя заняткі і адзнакі за адказ на экзамене. Ідэя ў тым, каб зменшыць уплыў выпадковых фактараў на ацэнку ведаў навучэнца. Хіба не можа студэнт прыйсці на экзамен хворым ці з-за іншых надзвычайных абставін падрыхтавацца дрэнна? Раней ён атрымаў бы дрэнную адзнаку ў залікоўку. Зараз жа, калі студэнт вучыўся ў семестры добра, яго адзнака часткова кампенсуецца. Або адваротная сітуацыя. Студэнт мінімальна наведваў практычныя заняткі і лекцыі, ледзь атрымаў допуск да экзамену, прыйшоў здаваць. Яму пашанцавала: трапіўся білет, які студэнт дасканала ведае. Раней ён атрымаў бы добрую адзнаку, але зараз праз уплыў адзнак за семестр канчатковая адзнака пагоршыцца. Каэфіцыенты ўплывовасці адміністрацыя факультэтаў можа вызначаць па ўласным меркаванні. У суме атрымліваецца 1. Напрыклад, 0,5 бягучая адзнака + 0,5 экзаменацыйная адзнака, ці 0,4 + 0,6 адпаведна, ці неяк інакш.

«Вы можаце спытаць: чаму мы не вызначыліся адразу, чаму нельга зрабіць аднолькавыя каэфіцыенты па ўсім універсітэце? Надта шмат было спрэчак з гэтай нагоды. Я лічу, што гэтага рабіць нельга, бо ў нас неаднародная ВНУ. Розныя дысцыпліны, розныя формы справаздачнасці, розныя факультэты... Але, напрыклад, я ведаю, што ФПМІ прыняў адназначнае рашэнне на савеце факультэта, які працэнт будзе складаць бягучая адзнака, а які – экзаменацыйная. На іншых факультэтах рашэнне прымаюць на кафедрах. Дзе вельмі вялікая колькасць семінарскіх, практычных або лабараторных заняткаў, значнасць бягучай адзнакі, як правіла, вышэйшая», – растлумачыла Людміла ХУХЛЫНДЗІНА.

## «Аўтаматы» легалізавалі

Так званыя «аўтаматы» да гэтага часу ставіліся паўлегальна, бо гэтая працэдура не была прапісаная ў афіцыйных дакументах, але з нядаўняга часу яе ўсё ж легалізавалі. Трэба памятаць, што не ўсе прадметы можна здаць аўтаматычна. Людміла ХУХЛЫНДЗІНА раіць не выкарыстоўваць гэтую працэдуру там, дзе курс не перакрываецца ўсімі заняткамі і застаецца частка для самастойнага вывучэння.

«Існуе неабходнасць скарачэння колькасці лекцыйных заняткаў і павелічэння практыкі. Ёсць кнігі, ёсць інфармацыйныя матэрыялы, якія можна знайсці (у інтэрнэце). Пераказваць падручнік няма сэнсу», – адзначыла начальнік ГУНВМР падчас размовы пра новыя вучэбныя планы.

## Факультатывы не абавязковыя

Людміла Хухлындзіна нагадала, што факультатывы, у адрозненне ад курсаў па выбары, не абавязковыя і ніхто не можа прымусіць на іх запісвацца. Максімальная колькасць залікаў на адзін семестр – 6 (+1 залік па фізкультуры). Але калі студэнт запісаўся на факультатыў, то ён павінен здаваць залік і па яго курсе нават звыш максімуму. Так можа выйсці і 8, і 9 залікаў. Таму варта добра ацэньваць свае сілы, калі запісваешся на дадатковыя курсы. Зразумела, трэба ўлічваць, што факультатыў – гэта тая паслуга, якую ўніверсітэт прапануе бясплатна.

## Рэйтынгавая сістэма яшчэ не паўсюль

Як высветлілася, юрыдычны каледж у складзе БДУ застаўся без рэйтынгавай сістэмы і вымушаны працаваць па старой схеме, бо падпарадкоўваецца Палажэнню аб сярэдніх навучальных установах. У зале пацікавіліся: ці распаўсюдзіцца рэйтынгавая сістэма на юркаледж у найбліжэйшы час? «Гэта залежыць перш за ўсё ад кіраўніцтва юрыдычнага каледжа, – адказвае газеце начальнік ГУНВМР. – Яны павінны распрацаваць адпаведнае палажэнне».

Сустрэча працягвалася гадзіну дваццаць, акурат як пара. Калі пытанні скончыліся, Людміла Міхайлаўна падкрэсліла, што як начальнік Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы яна не закрытая, прымае студэнтаў з іх прапановамі і праблемамі.

**Віталь АРЭШКА**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Ізноў першыя

**Студэнцкая каманда «Атэізм голуба» факультэта філасофіі і сацыяльных навук стала пераможцам V Міжнароднай міжуніверсітэцкай алімпіяды па асновах псіхалогіі і педагогікі «Асоба і Інавацыі».**

Спаборніцтва завяршылася 22 красавіка ў Гомельскім дзяржуніверсітэце імя Францыска Скарыны.

У склад каманды ўвайшлі чацвёртакурснікі, якія навучаюцца па спецыяльнасці «Псіхалогія», *Кацярына Барысенка, Канстанцін Каштанаў, Ілья Лемец, Марыя Майсяйчук, Уладзімір Слука і Дзіна Страпко.*

Кіраўніком была старшы выкладчык кафедры псіхалогіі БДУ ***Галіна Фафанава***. Сёлета ў алімпіядзе бралі ўдзел 22 каманды ВНУ Беларусі і Расіі, сем з іх – псіхалагічнага профілю.

Наша каманда стала пераможцам у трох турах з чатырох: тэарэтычным (анлайн-тэсціраванне па асновах псіхалогіі і педагогікі), практычным (інавацыйны праект) і творчым (візітоўка каманды). У туры «Крэатыўнае фота каманды» «Атэізм голуба» заняла трэцяе месца па ацэнках журы, але першае па меркаванні карыстальнікаў сацыяльнай сеткі «УКантакце» – каманда перамагла ў намінацыі «Зоркі ў сетцы». Яна таксама стала пераможцам у намінацыях «Псіхалагічнае вынаходства», «Інтэлектуальны гумар», «Псіхажурналістыка» і «Відэарадыус». У індывідуальным заліку Кацярына Барысенка заняла трэцяе месца ў тэарэтычным туры, Уладзімір Слука стаў пераможцам намінацыі «Артыстызм».

У міжнароднай міжуніверсітэцкай алімпіядзе па асновах псіхалогіі і педагогікі студэнты-псіхолагі БДУ пад кіраўніцтвам Галіны Фафанавай удзельнічаюць ужо трэці год. У 2014 г. каманда «Юнгі капітана Юнга» заняла трэцяе месца, у 2015 г. «FROMM Адлер» заваявала першае месца, і ў 2016 г. перамагла каманда «Атэізм голуба». Яна таксама была фіналістам-прызёрам (2 месца) у студэнцкай алімпіядзе па псіхалогіі «Псіялімп–2015», якая арганізуецца кафедрай псіхалогіі БДУ, але іх шлях у студэнцкім алімпіядным руху пачаўся яшчэ ў 2012 г. – на першым курсе студэнты выдатна заявілі пра сябе ў «Псіялімпе–2012».

Каманда «Атэізм голуба» і іх кіраўнік дзякуюць кіраўніцтву факультэта і кафедры псіхалогіі ў арганізацыйнай падтрымцы ўдзелу ў алімпіядзе, кіраўніцтву і калектыву тэлецэнтра Інстытута журналістыкі БДУ за пляцоўку для здымак праекта, а таксама студэнцкай супольнасці нашага ўніверсітэта за галасы, аддадзеныя за каманду ў туры «Крэатыўнае фота каманды».

**Алена ЯКАВЕНКА**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: міжнародных адносін, раманскіх моў;
ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ мытнай справы;
ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: крыміналістыкі, дыпламатычнай і консульскай службы, гісторыі новага і найноўшага часу, міжнароднага права, міжнародных эканамічных адносін, мытнай справы, медыялогіі і вэб-журналістыкі;
СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, міжнароднага права, міжнародных эканамічных адносін, мовазнаўства і краіназнаўства Усходу, тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай;
ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі новага і найноўшага часу, германскіх моў, міжнародных эканамічных адносін.
*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А.Д.САХАРАВА БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ экалагічнай і малекулярнай генетыкі;
ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ экалагічнай медыцыны і радыебіялогіі;
ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ імуналогіі (0,5 ст.);
ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ энергаэфектыўных тэхналогій (0,5 ст.);
СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры філасофіі, сацыялогіі і эканомікі (0,25 ст.)
*Адрас: 220070 г. Мінск вул. Даўгабродская, 23, корпус 1, аддзел кадравай і арганізацыйнай работы, пакой 202, тэл. 230-16-95.*

**ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛА БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

ПРАФЕСАРА кафедры тэалогіі.
*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: 220030 г. Мінск, праспект Незалежнасці, 24, каб. 209, аддзел кадраў. Тэлефон: + 375-17-327-55-71.*

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**01 мая Пакаціла Юрый Мяфодзьевіч,** дацэнт кафедры фізічнай інфарматыкі і атамна-малекулярнай фізікі
**02 мая Кірылава Таццяна Дзмітрыеўна,** дацэнт кафедры англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў
**10 мая Руцкі Аркадзь Уладзіміравіч,** прафесар кафедры менеджменту эканомікі сацыяльнай сферы
**11 мая Хажэмпа Сяргей Уладзіслававіч,** дацэнт кафедры фізвыхавання і спорту
**12 мая Шахназаран Нарынэ Марціросаўна,** дацэнт кафедры замежнай літаратуры
**13 мая Курыловіч Наталля Вячаславаўна,** дацэнт кафедры сацыялогіі
**14 мая Томашава Іна Рыгораўна,** дацэнт кафедры этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтва
**18 мая Аўсяннікаў Андрэй Вітальевіч,** дацэнт кафедры інфармацыйных тэхналогій
**22 мая Шчаглова Наталля Леанідаўна,** дацэнт кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу
**28 мая Анохіна Вера Сцяпанаўна,** дацэнт кафедры генетыкі

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**«Даніна модзе ці будучыні?» (інтэрв'ю рэктара БДУ Сяргея Абламейкі)** – «Звязда», zviazda.by (30.04).

**Выкладчыкі БДУ і Цукубскага ўніверсітэта (Японія) выпусцілі кнігу «Спрабуйма!» для вывучэння беларускай мовы японцамі** – БелТА, sputnik.by, marketing.by, БелаПАН, 21.by (04.04), tut.by, zviazda.by, «Звязда», радыё «МІР» (05.04), БТ-1, СТБ (06.04), Беларусь-24 (07.04), «Настаўніцкая газета» (09.04).

**Упершыню каманда студэнтаў БДУ ўвайшла ў топ-16 міжнароднага конкурсу па міжнародным праве імя Джэсапа** – ecopress.by, pravo.by, megacat.by (01.04), minsknews.by (02.04), sb.by (04.04), tut.by (05.04), «СБ-Беларусь сёння» (13.04), АНТ (15.04).

**Гран-пры IV конкурсу літаратурнай творчасці «Славянскі калейдаскоп–2016» заваявала студэнтка 4 курса Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ Кацярына Страйлова** – minsknews.by, megacat.by (05.04).

**Другакурснік філалагічнага факультэта БДУ Юрый Аношка заняў першае месца ў міжнародным конкурсе «Les Mots d'Or»/ «Залатое слова»** – interfax.by, aif.by (07.04), budny.by (08.04).

**Конкурс відэаролікаў «Уцекачы: новыя выклікі і адказы» адбыўся ў БДУ** – hand-embroidered10.rssing.com (07.04), studlive.by (09.04), shliah.by (10.04), minsknews.by (11.04).

**Пра акцыю «Разам супраць наркотыкаў!» у Беларускім дзяржаўным універсітэце** – megacat.by (10.04), para.by (11.04), sputnik.by, zn.sb.by, «Знамя юности» (13.04), Мінск-ТБ, БТ-1 (15.04).

**Пра ўдзел Фундаментальнай бібліятэцы БДУ ў акцыі «Бібліяноч»** – megacat.by, sputnik.by, hand-embroidered10.rssing.co (13.04), citydog.by (14.04), БелТА (18.04), zn.sb.by, «Знамя юности», tut.by (21.04), mk.by (22.04), СБ/Саюз Беларусь-Расія, sb.by (28.04).

**Пра выставу «Велікодных яек і паштовак» у БДУ** – Megacat.by (17.04), БелТА, Minsknews.by, Interfax.by, БелаПАН, Naviny.by, Wuz.by, Krynica.info, Belnovosti.by (18.04), БТ-1 (29.04).

**Духоўна-асветніцкае мерапрыемства «Напярэдадні Вялікадня» ўпершыню адбылося ў БДУ** – studlive.by (25.04), БелТА, vefire.ru, 1 Нацыянальны канал беларускага радыё, АНТ, СТБ, Мінск-ТБ (27.04), minsknews.by, БТ-1 (28.04).

**Два нацыянальныя рэкорды па зборцы кубіка Рубіка ўсталяваў першакурснік факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ Павел Юшкевіч** – hand-embroidered10.rssing.com, megacat.by (21.04), minsknews.by, postkomsg.com, soyuz.by (22.04), sputnik.by, 21.by, wuz.by (23.04), mail.ru, БелТА, Мінск-ТБ, АНТ, БТ-1, reporter.com.ua (24.04), «Знамя юности», zn.sb.by (28.04).

**Дні беларускай гісторыі ўпершыню прайшлі ў БДУ** – hand-embroidered10.rssing.com (25.04), minsknews.by (27.04).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ

5 мая 2016 года, № 7 (2154)

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

Яшчэ фота і відэа gazeta.bsu.by

# Рыцарскія баі і сярэднявечныя танцы ў БДУ

Дні беларускай гісторыі ўпершыню прайшлі 27–28 красавіка ў Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ.

Усіх гасцей мерапрыемства віталі *дырэктар ДІКСТ* ***Пётр Брыгадзін*** і *намеснік дэкана гістарычнага факультэта БДУ* ***Аляксандр Каханоўскі*** ў строях шляхты ВКЛ. Пасля ўрачыстага адкрыцця Дзён беларускай гісторыі пачалася анімацыйная лекцыя «10 стагоддзяў ваярскай справы на Беларусі». Студэнты, магістранты і выкладчыкі гістарычнага факультэта распавялі пра эвалюцыю ўзбраення і абмундзіравання ваяроў беларускіх земляў з X па XX стагоддзе. З удзелам касцюмаванай анімацыйнай групы, былі прадстаўлены гістарычныя прыклады варагаў, тэўтонаў, рыцараў Вялікага Княства Літоўскага, татараў, шляхты, салдат часоў напалеонаўскіх войнаў, рыштунак перыяду ампір (другая палова 19 ст.), абмундзіраванне часоў Першай сусветнай вайны. З усімі ваярамі можна было сфатаграфавацца, патрымаць у руках зброю, прымерыць элементы ваеннага абмундзіравання.

Працягнулася мерапрыемства камандным баталіямі ў інтэлектуальнай гульні «Гістарычная азбука». Каманды, сфарміраваныя з 10 студэнтаў кожнай спецыяльнасці, выявілі за перамогу адчайна і самааддана. Студэнты часам так хутка адказвалі на пытанні, што вядучы нават не паспяваў да канца зачытаць заданне. У гэтым баі не было пераможаных. Кожны ўдзельнік атрымаў у падарунак кнігу з памятным надпісам ад гістарычнага факультэта БДУ.

Атмасферу свята дапоўніла выступленне музычнай групы «Літы талер». Размясціўшыся ва ўнутраным дворыку інстытута, музыкі ў нацыянальнай вопратцы не толькі ігралі сярэднявечную музыку на гістарычных музычных інструментах, але і далі майстар-клас па традыцыйных танцах. Гэта было вельмі займальна.

На наступны дзень у дворыку інстытута адбылася лекцыя пра тэхнікі фехтавання, тактыкі наступальнага і абарончага бою. Сябры клуба гістарычнай рэканструкцыі правялі паказальныя рыцарскія баі.

Гледачы змаглі замацаваць атрыманыя веды, пазмагаўшыся з каскадзёрамі на мяккіх мячах. Вельмі спрытна і адважна праявілі сябе дзяўчаты.

Не менш весела і цікава прайшоў майстар-клас па сярэднявечных танцах пад жывое гучанне беларускай дуды, гусляў, ірландскай базукі і іншых гістарычных інструментаў.

Усе ахвотнікі з задавальненнем прынялі ўдзел у сярэднявечных забавах, выявіўшы сваю сілу, спрыт і кемлівасць у гульні «Серсо» (кіданне кольцаў на меч) і ва ўтрыманні мяча на выцягнутай руцэ. Самыя адважныя рызыкнулі пагуляць у «Млын», дзе ўдзельнікам неабходна было зняць шапку з вядучага, які раскручвае мяшок, прывязаны за вяроўку. А завяршылася мерапрыемства канцэртам сярэднявечнай музыкі групы Hardwood.

Апроч асноўных мерапрыемстваў, удзельнікі Дзён беларускай гісторыі зладзілі дзве займальныя экскурсіі. Яны наведалі Верхні горад і плошчу Свабоды, а таксама Ракаўскае прадмесце і Петрапаўлаўскую царкву.

**Наталля УСЦЮШЭНКА,**
**старшы выкладчык**

ШКОЛА АКТЫВУ

# Проста космас!

«Авы куды з сумкамі?» Менавіта такую фразу мог пачуць кожны, хто стаяў сонечнай раніцай каля шостага інтэрната. 12 красавіка самыя актыўныя, творчыя і яркія студэнты Студэнцкага гарадка БДУ «адправіліся ў космас», бо тэмай новай «школы актыву» стаў «Космас»: кожны орган студэнцкага самакіравання паўстаў у выглядзе планеты. Давайце ўспомнім, як гэта было, і, як сказаў Юрый Гагарын: «Паехалі!»

## #выбары спадарожніка

Выязны семінар-практыкум «Школа студэнцкага актыву» Студэнцкага гарадка БДУ па традыцыі пачаўся з урачыстага адкрыцця і клятвы старшыняў студэнцкіх саветаў. Настроіцца на добрую працу дапамог трэнінг на камандаўтварэнне «Шоу Рум».

Вяршыня палёту першага дня – выбары новага старшыні каардынацыйнага савета Студэнцкага гарадка БДУ. Цэлы дзень удзельнікі «школы актыву» маглі бачыць плакаты з надпісам «З Зубок усё будзе ОК!», чуць бясконцае «Галасуй за Гаморыну!» і трымаць у руках паперку «Будзь коцікам, галасуй за нашу Таню!». І гэта не проста так, бо на пасаду новага старшыні каардынацыйнага савета намінаваліся тры выдатныя лэдзі: *Ганна Гаморына*, старшыня студсавета інтэрната № 4, *Алеся Зубок*, старшыня савета па прафілактыцы, і *Таццяна Лавіцкая*, сябра студсавета інтэрната № 2. Пасля прадстаўлення праграм дэлегатаў на пасаду старшыні каардынацыйнага савета і прэс-канферэнцыі было адкрыта галасаванне, упэўненую перамогу ў якім атрымала ***Ганна Гаморына*** (65 % галасоў).

Вераніка Луд з наказам перадала свае паўнамоцтвы новай старшыні, а Ганна падзялілася першымі думкамі: «Шчыра спадзяюся, што ў нас атрымаецца і складзецца праца з каардынацыйным саветам, а таксама з іншымі арганізацыямі. Усё будзе проста супер!»

## #парад планет

Раніца другога дня пачалася з энергічнай зарадкі, пасля якой студэнты адправіліся адкрываць для сябе «яркія зоркі». Наведванне адукацыйных трэнінгаў дапамагло студэнтам набыць новыя веды і ўдасканаліць наяўныя. Як рэагаваць на негатыў у свой бок і кантраляваць эмоцыі? «Спакой, толькі спакой!» – падказвае нам псіхалагічная служба БДУ.

Яўгенія Кашлей на форуме-тэатры «Увага – ключ да разумення» вучыла студэнтаў весці перамовы і шукаць выйсце з канфліктных сітуацый. Самае галоўнае: падчас гэтага трэнінгу кожны мог сам паспрабаваць знайсці патрэбныя словы і вырашыць праблемную сітуацыю.

Вольга Зуеўская на трэнінгу па прамоўніцкім мастацтве раскрыла таямніцы пераканаўчага маўлення і падзялілася сакрэтам паводзін лідара на сцэне, а пры дапамозе Яўгена Харука на трэнінгу «Матывацыя» студэнты навучыліся ставіць мэты і матываваць навакольных.

У гэты дзень адбылася сустрэча з рэктарам Сяргеем Абламейкам. Сяргей Уладзіміравіч займальна распавёў пра космас і першы палёт Юрыя Гагарына, адказаў на ўсе

*Ганна Гаморына і Вераніка Луд*

пытанні, а затым падчас круглага стала пагутарыў з лідарамі органаў самакіравання студгарадка. «Ужо, напэўна, у пяты раз за гэты навучальны год я прыязджаю ў «Брыганціну» на сустрэчу з рознымі органамі студэнцкага самакіравання БДУ. У рэктара заўсёды шмат клопатаў, але, калі гутарыш з вамі, разумееш, што гэта вельмі прыемныя і добрыя моманты майго жыцця. Сёння ў нас былі такія фармальныя і нефармальныя зносіны, такая навуковая касмічная тэма – я вельмі рады і ганаруся вамі, студэнтамі».

Крэатыўнасць і арыгінальнасць студэнты змаглі выявіць у конкурсе «Відэаагучка» і ў творчых нумарах, якія праходзілі ў рамках конкурсу «Каманда мары». Да прэзентацыі сваёй планеты кожная каманда падышла творча. Напрыклад, «Тройка» паўстала перад гледачамі ў выглядзе загадкавых жыхароў планеты «Акйёрт», «двойка» прыляцела з планеты Хорару, удзельнікі з «чацвёркі» з планеты «Kepler 452» зачыталі рэп і сабралі ўдзельнікаў «школы актыву» на сцэне, «Людзі будучыні» (інтэрнат № 10) прадставілі светлавое шоу.

Напрыканцы вельмі насычанага і яркага дня ўсе планеты сабраліся на падвядзенні вынікаў года. Самыя годныя прадстаўнікі органаў студэнцкага самакіравання былі ўзнагароджаны дыпломамі і партрэтамі.

## #планета мары

Раз-два-тры-чатыры, рукі вышэй – ногі шырэй! І па традыцыі: ранішняя зарадка. Спартыўны пачатак дня плаўна перацякаў у не менш спартыўнае мерапрыемства – эстафету, перамогу ў якой атрымаў інтэрнат № 2.

Не толькі спорт, але і інтэлектуальная гульня чакала студэнтаў у трэці дзень. Пераможцам гульні стаў інтэрнат № 4.

На працягу трох касмічных дзён студсаветы інтэрнатаў змагаліся за ганаровае званне «Каманда мары». Ці існуе яна наогул? Пасля ўсіх выпрабаванняў і конкурсаў намеснік прарэктара Міхаіл Чарапеннікаў упэўнена змог сказаць: «Так!» І ў гэты раз ёй стаў студсавет інтэрната № 4.

На 72 гадзіны студэнты БДУ стварылі свой маленькі дружны касмічны свет, напоўнены эмоцыямі і шчасцем. Зараз на пытанне: «А вы куды з сумкамі?» – можна смела адказваць: «У месца, якое аб'ядноўвае…»

**Лізавета ДАЙНЕКА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

5 мая 2016 года
Падпісана да друку 4.05.2016 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***